# У «Звязды» з'явіўся падпісчык, якому амаль 100 гадоў

## У Радуні прайшоў Дзень падпісчыка ў рамках дня інфармавання насельніцтва

**У сустрэчы з мясцовымі жыхарамі ўзялі ўдзел старшыня Воранаўскага райсавета Алена ГАНЕВІЧ, старшыня Радунскага сельвыканкама Андрэй ШЫНКЕВІЧ, начальнік сектара ідэалогі і па справах моладзі Лілія СІДАРОВІЧ, дырэктар школы Святлана ПАЧОБУТ, начальнік Воранаўскага райаддзела па надзвычайных сітуацыях Алег ВАЛАСЕВІЧ.**



Алег ВАЛАСЕВІЧ атрымаў падарунак ад «Звязды».

Мясцовыя жыхары сабраліся ў сельскім выканаўчым камітэце. Тэма дня інфармавання датычылася выхавання патрыёта і ролі гісторыка-культурных каштоўнасцяў у фарміраванні асобы.

Цікавы праект прадставіла Радунская сярэдняя школа. Як расказала яе дырэктар Святлана Пачобут, тут некалькі гадоў дзейнічае пошукавы атрад, які збірае матэрыялы аб баявой славе вёсак, што знаходзяцца на тэрыторыі сельскага Савета. Вучні наведваюць знакавыя мясціны, звязаныя з ваеннымі гадамі, шукаюць сведкаў ваеннага ліхалецця, запісваюць успаміны тых, хто перажыў вайну. У школе ёсць сваё тэлебачанне, таму матэрыял прадстаўлены ў фармаце відэароліка. Творчая група вучняў сваімі сіламі здымала і манціравала фільм.

Жыхары Радуні змаглі пазнаёміцца з творчым праектам пошукавага атрада.

Па словах старшыні Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў Алены Ганевіч, кожны сельскі Савет прадстаўляе матэрыял аб ваенным жыцці вёсак. Такім чынам складваецца паўнавартасная гісторыя ўсяго раёна ў відэафармаце. Гэты матэрыял будзе пакладзены ў аснову віртуальнай кнігі «Памяць. Воранаўскі раён у гады Вялікай Айчыннай вайны». У падрыхтоўцы віртуальнай кнігі таксама выкарыстоўваецца матэрыял папяровага выдання кнігі «Памяць». Прэзентацыя праекта пройдзе ва ўсіх сельскіх Саветах Воранаўскага раёна, адзначыла Алена Ганевіч.

Увогуле, тэма патрыятызму датычыцца не толькі ваеннага мінулага. Тут варта згадаць і нашу культурна-гістарычную спадчыну. Менавіта такі пасыл адрасавала аўдыторыі начальнік сектара ідэалогіі і па справах моладзі Лілія Сідаровіч. Яна заўважыла, што выхаванне патрыятычнай свядомасці закладваецца з дзяцінства, важную ролю ў гэтым адыгрывае школа. Аднак не трэба забывацца і пра сям'ю. Напрыклад, наведванне з бацькамі аб'ектаў культурна-гістарычнай спадчыны. Такія экскурсіі ў рамках адной сям'і вельмі карысныя як у сэнсе знаёмства з гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, так і ўмацавання сямейных адносін. Аб'ектаў для сумесных вандровак хапае. Вось і на тэрыторыі Воранаўскага раёна знаходзяцца 22 такія аб'екты, звярнула ўвагу Лілія Сідаровіч. Сярод іх і помнікі культуры, гісторыі, археалогіі, аб якіх многія нават не ведаюць. Таму перад установамі адукацыі ставіцца задача — прыцягваць у такія экскурсіі сем'і, каб наведванне знакавых мясцін стала для іх традыцыяй. Папулярнымі становяцца туры выхаднога дня па Беларусі.

Дарэчы, папулярызацыя гэтай тэмы праводзіцца і на старонках газеты «Звязда». Прысутныя змаглі азнаёміцца з асноўнымі рубрыкамі газеты, тэмамі, якія з'яўляюцца на старонках найстарэйшага рэспубліканскага выдання. У газеты слаўнае ваеннае мінулае, яна не спыняла сваю дзейнасць і ў гады акупацыі, выдавалася ў партызанскіх зямлянках. Сёння чытачы атрымліваюць патрэбную інфармацыю на самыя актуальныя тэмы, асвятляюцца падзеі, што адбываюцца ў грамадстве.

Трэба сказаць, што пасля прэзентацыі колькасць прыхільнікаў «Звязды» павялічылася. Напрыклад, новым падпісчыкам стаў начальнік Воранаўскага раённага аддзела па НС Алег Валасевіч. Асабліва радуе той факт, што да падпісной кампаніі далучыўся ветэран вайны Іван Адамавіч Носаль, які пражывае ў Радунскім сельскім Савеце. А ўсяго на тэрыторыі Воранаўскага раёна жывуць чатыры ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. Праўда, сам Іван Адамавіч на змог прыехаць на сход з-за даволі сталага ўзросту: яму 99 гадоў, і мясцовыя ўлады спадзяюцца, што ў наступным годзе павіншуюць яго са 100-гадовым юбілеем. Вядома, свайго падпісчыка павіншуе і газета «Звязда». Дарэчы, усе, хто аформіў падпіску, атрымалі сувеніры з лагатыпам газеты.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# СТРАТЭГІЯ НА ХУТКАСЦЬ

## Чаму Гродзенскі філіял РУП «Белпошта» застаецца ў ліку топавых сэрвіс-паслуг

**З развіццём інфармацыйных тэхналогій сутнасць пошты наўрад ці змянілася. Людзі як атрымлівалі паштовыя адпраўленні, так і атрымліваюць. Але многія традыцыйныя паслугі сёння працуюць на новых платформах. Пашырыўся спектр саміх паслуг. Цяпер іх каля 60. Пра самыя папулярныя і новыя сэрвісы сучаснай пошты — у інтэрв'ю з дырэктарам Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта» Андрэем АНІСІМАВЫМ.**



***— Андрэй Віктаравіч, які сёння структурны састаў Гродзенскага філіяла РУП «Белпошта»?***

— Гродзенскі філіял РУП «Белпошта» з'яўляецца прадстаўніком нацыянальнага аператара паштовай сувязі ў Гродзенскай вобласці. Гэта адзін з сямі філіялаў РУП «Белпошта». Гродзенскі філіял РУП «Белпошта» ўтвораны 1 красавіка 1996 года. Рэарганізацыя закранула і структуру прадпрыемства. Калі да 2004 года ў яго склад уваходзіла 17 вузлоў паштовай сувязі, то на сённяшні дзень Гродзенскі філіял складаецца з галаўнога падраздзялення, аб'яднанага цэха паштовай сувязі горада Гродна, шасці рэгіянальных вузлоў і дзевяці ўчасткаў паштовай сувязі.

***— Як абслугоўваецца сельскае насельніцтва?***

— Хачу назваць канкрэтныя лічбы. Зараз у Гродзенскай вобласці функцыянуе 364 аб'екты паштовай сувязі. Большасць з іх сельскія — 250. У нас працуе 23 перасовачныя аб'екты. Гэта — аддзяленні сувязі «на колах». З дапамогай транспартных сродкаў мы абслугоўваем тыя населеныя пункты, дзе няма пастаяннага аддзялення. Працуе 46 пунктаў паштовай сувязі там, дзе колькасць насельніцтва невялікая. У сямі гарадах вобласці дзейнічае падраздзяленне «Бізнес-пошта» для абслугоўвання юрыдычных асоб і карпаратыўных кліентаў.

На дарогі вобласці выязджае 288 аўтамабіляў амаль па 200 маршрутах. Напрыклад, па 21 маршруце ў Гродне вадзіцелі праязджаюць больш як 22 тысячы кіламетраў у дзень.

***— Чым адметная ваша каманда супрацоўнікаў?***

Наш калектыў — гэта 2434 прафесіяналы сваёй справы. Большасць работнікаў — жанчыны. Нямала ў нас і моладзі — чацвёртая частка калектыву. У нас працуюць 636 паштальёнаў, амаль 590 спецыялістаў. Дзякуючы згуртаванай камандзе прафесіяналаў Гродзенскі філіял РУП «Белпошта» прапануе кліентам больш як 60 відаў паслуг. У іх ліку паштовыя, кур'ерскія, банкаўскія, страхавыя і іншыя. Яны ў поўным аб'ёме даступныя ў любым населеным пункце Гродзенскай вобласці. Іх можна атрымаць на аб'ектах паштовай сувязі, дома альбо ў офісе.

***— Раскажыце падрабязней пра тыя паслугі, якія цяпер найбольш папулярныя.***

— У нас шырокі пералік запатрабаваных паслуг. Гэта, вядома, прыём і выдача рэспубліканскіх і міжнародных паштовых адпраўленняў. Папулярныя фінансавыя паслугі — паштовыя грашовыя пераводы, выплата пенсій і дапамог, банкаўскія паслугі, плацяжы, кур'ерскія паслугі.

Мы працуем на хуткасць. Сёння гэта важны фактар. Паскоранае атрыманне адпраўленняў ажыццяўляецца праз паштаматы (іх два ў рэгіёне). У ліку паслуг — страхаванне і набыццё бланкаў дакументаў з вызначанай ступенню абароны.

Мы пастаянна ўкараняем новыя сэрвісы і паслугі, якія спрыяюць паскоранаму атрыманню адпраўленняў. Раскажу больш падрабязна пра Нацыянальную паштовую электронную сістэму.

Гэта адзін з новых фарматаў — электронная форма для перасылкі простых і заказных пісьмаў. Нацыянальная паштовая электронная сістэма ўкаранёна ў пачатку 2021 года і забяспечвае канфедэнцыяльнасць ды бяспеку перапіскі на сучасным узроўні з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій. Дзякуючы гэтаму сэрвісу карыстальнікі ажыццяўляюць прыём, апрацоўку, дастаўку паштовых адпраўленняў, а таксама перасылку гібрыдных адпраўленняў — з электроннай формы ў папяровую.

***— Як адбываецца такая перасылка? Наколькі гэта складаны працэс?***

— Для перасылкі карыстальнік стварае ў НПЭС электронную паштовую скрыню. На гэты адрас яму прыходзіць паведамленне аб паштовым адпраўленні. Адрасату не патрэбны дапаўняльныя рэквізіты і ідэнтыфікатар. Ён атрымае паведамленне на нумар тэлефона альбо e-mail. Для атрымання і прачытання пісьма адрасату толькі трэба ўвайсці ў электронны паштовы адрас.

Калі адрасат не зарэгістраваны ў Нацыянальнай паштовай электроннай сістэме, РУП «Белпошта» аўтаматызавана раздрукуе і сканверсуе ўлажэнне, а пасля даставіць на патрэбны паштовы адрас. Пры гэтым гарантуюцца тайна паштовай сувязі, бяспека і канфедэнцыяльнасць перапіскі. Перасылка электронных пісьмаў ажыццяўляецца па абароненых каналах перадачы даных з выкарыстаннем сертыфікаваных сродкаў крыптаграфічнай абароны інфармацыі.

***— Я ведаю, што цяпер можна атрымліваць паштовыя адпраўленні без усялякіх квітанцый...***

— Гэта можна ажыццявіць у аддзяленнях паштовай сувязі на падставе SMS-кода без прад'яўлення пашпарта і запаўнення квітка-паведамлення. Для гэтага неабходна зарэгістравацца ў асабістым кабінеце і ўвесці даныя дакумента, як правіла, пашпарта. Раздрукаваць і запоўніць заяву можна ў аддзяленнях паштовай сувязі.

Дзякуючы дадзенаму сэрвісу няма неабходнасці запаўняць папяровыя квіткі і паказваць пашпарт. Кліенту варта толькі назваць сваё прозвішча, адрас альбо нумар адпраўлення, а таксама нумар тэлефона, указаны пры рэгістрацыі. Менавіта на гэты нумар паступіць аднаразовы SMS-код. Яго і трэба будзе паведаміць аператару. Сэрвіс бясплатны. Адначасова паведамляецца, што адсачыць статус адпраўлення можна на сайце прадпрыемства, а таксама з дапамогай мабільнага дадатку РУП «Белпошта» (App Store, Google Play). Пры атрыманні статуса «паступіла ва ўстанову дастаўкі» можна атрымаць адпраўленне без папяровага квітка.




Сучасная пошта — надзейны лагістычны партнёр. Прадпрыемства прапануе розныя варыянты даставак у любы пункт Беларусі. Ад элітных («дзверы-ў-дзверы») да бюджэтных (аддзяленне — аддзяленне). Гэта дазваляе паспяхова вырашаць многія лагістычныя задачы інтэрнэт-крамаў і гандлёвых сетак.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота з сайта філіяла.**

У цэнтры ўвагі

# ВУЗКІ СПЕЦЫЯЛІСТ ЦІ ЎНІВЕРСАЛЬНЫ?

## Як у БДУ дапамагаюць студэнтам спраектаваць індывідуальную адукацыйную траекторыю

**Адно з галоўных патрабаванняў да спецыяліста будучыні — наяўнасць у яго міждысцыплінарных навыкаў, бо ўсе адкрыцці цяпер робяцца на стыку навук. Прафесіяналы такога ўзроўню больш мабільныя, яны арыентуюцца ў некалькіх абласцях ведаў, бачаць задачу з розных бакоў і здольныя да вырашэння глабальных праблем. Для вышэйшай школы падрыхтоўка канкурэнтаздольных выпускнікоў з міждысцыплінарнымі ведамі і ўніверсальнымі кампетэнцыямі — сапраўдны выклік. Пра тое, як гэту задачу вырашаюць у Беларускім дзяржаўным універсітэце, мы гутарым з прарэктарам ВНУ па вучэбнай рабоце і адукацыйных інавацыях Аксанай ЗДРОК:**



— Час вузкапрафесійных навыкаў і вузкіх спецыялістаў прайшоў. Сёння да кваліфікаванага спецыяліста прад'яўляюцца патрабаванні глабальнага характару, якія выяўляюцца ў шырокай інтэграцыі гуманітарных, сацыяльных і тэхналагічных якасцяў. **Таму ў БДУ ўкараняецца так званая Стратэгія цэласнасці адукацыі, якая дапаўнае практыка-арыентаваны і кампетэнтасны падыход у падрыхтоўцы спецыялістаў.**

На рынку працы сёння дзейнічае тэорыя І-спецыяліста і Т-спецыяліста. І-спецыялісты — эксперты ў нейкай адной вобласці. А катэгорыя «Т» — гэта тыя работнікі, у якіх ёсць глыбокія веды ў пэўнай галіне, але шырокае кола кампетэнцый дазваляе ім эфектыўна працаваць за іх рамкамі і супрацоўнічаць з іншымі спецыялістамі ў самых розных галінах і дысцыплінах.

Студэнт, які навучаецца ў ВНУ, павінен атрымліваць цэласнае ўяўленне пра свет і вопыт цэласнай дзейнасці, а не толькі вузкапрафесійнай.Такая думка закладзена ў Стратэгію цэласнасці адукацыі. А дасягаецца гэтая задача наладжваннем міжфакультэцкіх і міжкафедральных сувязяў. Факультэтаў у нас шмат, бо БДУ — універсітэт класічнага тыпу: ёсць і прыродазнаўчыя, і гуманітарныя, і тэхнічныя спецыяльнасці. Таму ёсць шырокае поле для такой дзейнасці.

Увогуле для рынку працы сёння ўласцівая хуткая зменліваць і нестабільнасць. Мы рыхтуем спецыяліста на першай ступені вышэйшай адукацыі чатыры гады, а за гэты час і сама спецыяльнасць, і веды, якія атрымлівае студэнт, могуць страціць сваю актуальнасць. Таму важна быць мабільнымі і ўмець хутка адаптавацца. Турбулентны час патрабуе новых падыходаў... Мы спрабуем адысці ад вузкапрафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Прычым, на наш погляд, важна ўлічваць не толькі сацыяльны заказ на падрыхтоўку спецыяліста, але запыты студэнта ў плане яго самаразвіцця.

### Канікулы — не толькі для адпачынку

***— І як на практыцы рэалізоўваюцца міжфакультэцкія сувязі?***

— Адзін з напрамкаў — сумеснае выкладанне вучэбных дысцыплін. Напрыклад, эканамічны і юрыдычны факультэты сумесна чытаюць «Асновы інтэлектуальнай уласнасці» і «Асновы прадпрымальніцкай дзейнасці». Тое, што не мог сказаць юрыст, скажа эканаміст. Такім чынам, адзін аднаго дапаўняюць. Перспектыўны кірунак узаемадзеяння — укараненне групавых вучэбных праектаў, якія выконваюцца студэнтамі некалькіх факультэтаў ці спецыяльнасцяў сумесна ў рамках падрыхтоўкі курсавых, дыпломных і магістарскіх работ. З гэтай мэтай у найбліжэйшы час кафедры павінны распрацаваць міждысцыплінарныя тэмы для ўключэння іх у тэматыку дыпломных работ і магістарскіх дысертацый. Але тэматыка для праекта можа прапаноўвацца не толькі кафедрамі і структурнымі падраздзяленнямі БДУ. Гэта могуць зрабіць і знешнія заказчыкі, і самі студэнты. Работа кожнага ўдзельніка (курсавая, дыпломная ці магістарская дысертацыя) будзе часткай агульнага праекта.

У наступным навучальным годзе плануем укараніць такую форму работы, як «Тыдзень міжфакультэцкага ўзаемадзеяння». Усе ведаюць аб праекце для абітурыентаў «Стаць студэнтам на тыдзень». Дык вось, мы збіраемся прапанаваць нашым студэнтам таксама на працягу тыдня наведваць заняткі, навуковыя мерапрыемствы, лабараторыі, музеі на іншых факультэтах, каб пазнаёміцца з іх адукацыйна-навуковым патэнцыялам і завязаць карысныя знаёмствы, каб аб'яднацца ў каманду для выканання групавога праекта.

Вельмі эфектыўнымі мы лічым правядзенне летніх і зімніх анлайн-універсітэтаў, удзельнікамі якіх сталі ўжо больш за 500 студэнтаў. Падчас канікул усім ахвотным (у тым ліку і студэнтам іншых ВНУ) прапануецца праслухаць бясплатна курсы, якія могуць зацікавіць і быць карыснымі для прадстаўнікоў самых розных спецыяльнасцяў. Так, летам 2020 года студэнцкай моладзі былі прапанаваны 18 дысцыплін, а зімой бягучага года — 13. Сярод іх — «Web-праграмаванне», «Італьянская мова для пачаткоўцаў», «Тэхналогія электроннага навучання», «Пераклад у навуковай дзейнасці», «Займальная фотажурналістыка», «Выпуск вучэбнай газеты», «Гісторыя вялікіх археалагічных адкрыццяў», «Нумізматыка», «Маўленчае развіццё асобы», «Працоўнае права», «Крыміналогія», «Асновы прадпрымальніцтва і бізнесу», «Лічбавая бяспека» і іншыя. Курсы чытаюцца высокакваліфікаванымі айчыннымі і замежнымі спецыялістамі анлайн з выкарыстаннем Адукацыйнага партала БДУ.

### Генетыка — для матэматыка

***— Ведаю, што ў вашых студэнтаў ёсць таксама магчымасць вывучаць дадатковыя дысцыпліны на іншых факультэтах. Цікава, што яны выбіраюць?***

— Гэтая ўнікальная форма работы ўкаранёна пакуль толькі ў БДУ. Мэта праекта па фарміраванні індывідуальнай адукацыйнай траекторыі — пашырэнне ў студэнтаў прафесійных кампетэнцый.

Скарыстацца магчымасцю вывучаць дадаткова дысцыпліны па выбары могуць студэнты любога курса, а таксама магістранты ўсіх факультэтаў БДУ без выключэння. Навучанне па дадатковых дысцыплінах не абмяжоўваецца вучэбным курсам. Гэта значыць, што першакурснік пры жаданні можа абраць дысцыпліны, якія вывучаюцца, напрыклад, на чацвёртым годзе падрыхтоўкі. Выбіраць дадатковыя дысцыпліны можна як на сваім факультэце, так і на іншым. Выключэнне складаюць толькі замежныя мовы і англамоўныя курсы — іх дадаткова нельга абраць.

За два гады магчымасцю дадатковага навучання зацікавіліся 44 студэнты з дзесяці факультэтаў і Інстытута тэалогіі БДУ. У першы год яны абралі дадаткова 31 дысцыпліну, а на другі — 32. Многа гэта ці мала? Мы не фарсіруем сітуацыю, таму што вывучаць дадатковыя дысцыпліны можна толькі ў свабодны ад асноўнага раскладу час, а расклады на факультэтах часта супадаюць. Таму рэкамендуем выкладчыкам забяспечыць выкладанне дысцыплін, якія зацікавілі студэнтаў, праз Адукацыйны партал універсітэта дыстанцыйна.



Часцей за ўсё студэнты выбіраюць дадатковыя дысцыпліны на сваім факультэце толькі на іншых спецыяльнасцях. Але ёсць і вельмі цікавыя прыклады. Так, студэнт факультэта міжнародных адносін за два вучэбныя гады праслухаў дадаткова восем дысцыплін. Студэнт факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі вывучаў курс «Генетыка» на біялагічным факультэце. А студэнт Інстытута тэалогіі святых Мяфодзія і Кірыла БДУ зацікавіўся ІТ-дысцыплінай на ФПМІ. Студэнтка журфака вывучала на эканамічным факультэце «Ценявую эканоміку». Яшчэ адзін студэнт факультэта журналістыкі вывучаў на юрфаку «Грамадзянскі працэс». Увогуле, як паказала практыка, асабліва запатрабаваны ў студэнтаў дысцыпліны на факультэце міжнародных адносін.

Дадатковыя дысцыпліны вывучаюцца на платнай аснове, але памер платы зусім нязначны — прыблізна 34 рублі за курс, усё залежыць ад аб'ёму гадзін. Ёсць магчымасць не проста праслухаць курс, але і прайсці атэстацыю. Па выніках станоўчай атэстацыі абраныя курсы ўносяцца ў дадатак да дыплома. Гэта павышае «каштоўнасць» выпускніка ў вачах будучага наймальніка, бо сведчыць, што малады чалавек умее вучыцца, імкнецца да самаразвіцця і валодае важнымі кампетэнцыямі.

Да новага навучальнага года на сайтах усіх факультэтаў павінен з'явіцца пералік дысцыплін, якія могуць зацікавіць студэнтаў з іншых факультэтаў, каб моладзі было прасцей арыентавацца. Да таго ж мы сёння робім стаўку і на інстытут цьютарства. Што маецца на ўвазе? У БДУ кожны факультэт мае пералік унікальных адукацыйных і навуковых прапаноў, у нас дзейнічае шэраг маладзёжных арганізацый, творчых калектываў і спартыўных секцый. І студэнтам даволі складана сарыентавацца ў разнастайнасці паслуг. А цьютары з улікам персанальных запытаў студэнта змогуць аказаць яму кансультацыйную і інфармацыйную падтрымку. Пры планаванні навуковай работы міждысцыплінарнай накіраванасці — падбяруць найбольш перспектыўныя варыянты супрацоўніцтва з іншымі факультэтамі, сарыентуюць у пытаннях праходжання практыкі, паступлення ў магістратуру, у тым ліку на іншых факультэтах, у выбары дадатковых дысцыплін для навучання. Па сутнасці, цьютары будуць выступаць пасрэднікам паміж студэнтам і ўніверсітэтам. Падрыхтоўка такіх спецыялістаў арганізавана ў нас ва ўніверсітэце ў рамках праграмы павышэння кваліфікацыі «Цьютарскае суправаджэнне навучэнцаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі».

### Міждысцыплінарныя спецыяльнасці

***— Аксана Мікалаеўна, у расійскіх ВНУ ствараюцца вельмі цікавыя міждысцыплінарныя праграмы і спецыяльнасці: «Лічбавая крыміналістыка», «Навуковая камунікацыя», «Кіраванне развіццём гарадскога асяроддзя» і іншыя. БДУ як флагман айчыннай вышэйшай школы адсочвае гэтыя тэндэнцыі?***

— У бягучым годзе ў нас таксама адкрываюцца дзве абсалютна новыя спецыяльнасці, якія знаходзяцца на стыку розных дысцыплін: «Рэгіёназнаўства» на гістарычным факультэце і «Эканамічная бяспека» — на эканамічным. Падрыхтоўка спецыялістаў такога профілю ў беларускіх ВНУ раней не вялася.

Міждысцыплінарная спецыяльнасць «Эканамічная бяспека» інтэгравала найлепшыя айчынныя праграмы па эканоміцы, праве і інфармацыйных тэхналогіях у сферы бяспекі. Будучыя спецыялісты будуць вучыцца ацэньваць і прадухіляць магчымыя пагрозы і страты для прадпрыемстваў, маніторыць фактары, якія ўплываюць на іх эканамічную бяспеку, прагназаваць і кіраваць эканамічнымі рызыкамі. Выпускнікі змогуць свабодна арыентавацца ў адміністрацыйным, гаспадарчым, фінансавым і мытным праве.

> **«Па выніках станоўчай атэстацыі абраныя курсы ўносяцца ў дадатак да дыплома. Гэта павышае «каштоўнасць» выпускніка ў вачах будучага наймальніка».**

На міждысцыплінарнасць і фундаментальную падрыхтоўку па гуманітарных, эканамічных, палітычных, геаграфічных і юрыдычных навуках арыентавана і спецыяльнасць «Рэгіёназнаўства». Яе адкрыццё было абумоўлена запатрабаванасцю айчынных арганізацый і кампаній у супрацоўніках, якія валодаюць комплекснымі ведамі аб палітычных, эканамічных, сацыяльных, экалагічных, канфесійных, этнічных і культурных асаблівасцях пэўнага рэгіёна. Студэнты будуць асвойваць на павышаным узроўні дзве замежныя мовы, адна з якіх — мова краіны рэгіёна, што вывучаецца. Прадугледжана некалькі спецыялізацый: «Заходняя Еўропа і Паўночная Амерыка», «Цэнтральная і Усходняя Еўропа», «Бліжні Усход і Афрыка», «Азіяцка-Ціхаакіянскі рэгіён» і «Лацінская Амерыка».

Хачу заўважыць, што адкрыццё новай спецыяльнасці на першай ступені вышэйшай адукацыі — справа не аднаго дня. Каб адкрыць дзве вышэйзгаданыя, мы распачалі падрыхтоўку паўтара года таму. А вось у магістратуры, дзе тэрмін навучання складае год ці два, адкрыць новую міждысцыплінарную спецыяльнасць прасцей. Напрыклад, у магістратуры ў нас ёсць цікавая спецыяльнасць «Адукацыйныя тэхналогіі ў фізічнай культуры і спорце». Над напаўненнем яе зместу працавалі кафедра педагогікі і праблем адукацыі і кафедра фізічнага выхавання і спорту. Вынікам намаганняў факультэта журналістыкі і эканамічнага факультэта стала спецыяльнасць «Кіраванне медыяпраектамі». Эканамічны факультэт і факультэт філасофіі і сацыяльных тэхналогій аб'ядналіся і адкрылі спецыяльнасць «HR-Analitics» і гэтак далей. Зараз мы працуем над адкрыццём яшчэ некалькіх міждысцыплінарных спецыяльнасцяў на першай ступені. Спадзяёмся, што паспеем да прыёмнай кампаніі 2022 года.

***— А якія яшчэ перспектыўныя кірункі для развіцця ў сваіх выпускнікоў актуальных кампетэнцый вы бачыце?***

— Адзін з іх — прыцягненне знешніх кансультантаў пры напісанні дыпломных работ і магістарскіх дысертацый, калі работа мае міждысцыплінарны характар. Гэта могуць быць кансультанты з іншай кафедры, факультэта, нашых структурных падраздзяленняў ці патэнцыяльныя наймальнікі, напрыклад, работнікі СМІ ці дыпламатычнай і консульскай службы. Эфектыўнай мы лічым і арганізацыю практыкі студэнтаў на іншых нашых факультэтах і ў структурных падраздзяленнях БДУ — ва ўпраўленні выхаваўчай работы, міжнароднай дзейнасці, рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці, музеі гісторыі БДУ і іншых.

Мы цудоўна разумеем, што патрабаванні работадаўцаў да кампетэнцый выпускнікоў узрастаюць. Заказчыкі кадраў просяць нас сфарміраваць у студэнтаў так званыя soft-skiils — гэта крэатыўнасць, ініцыятыўнасць, гнуткасць і адаптыўнасць, адказнасць за прыняцце рашэнняў, эмацыянальны інтэлект, навыкі каманднай работы, эфектыўнай камунікацыі, здольнасці да самаарганізацыі, самарэфлексіі і самаразвіцця. Так што працуем у гэтым кірунку. Але фарміраванне ўніверсальных кампетэнцый — задача не толькі сістэмы адукацыі, а сфера адказнасці кожнага.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота прэс-службы БДУ.**